# ШЛА КОЛЯДА ПО ЛЬДУ…

**Коляды и Новый год — одни из самых ярких праздников в годовом круговороте народных торжеств. Считается, что если весело провести первые дни нового года, то и последующие месяцы будут счастливыми. Народная культура предусмотрела все…**



Как колядует современная молодежь, зачем дарить подарки козе и что такое «кота печь»? Об этом знает этнофольклорный коллектив GUDA.

— Спяваць пачалі яшчэ ў 1992 годзе. Тады мы былі групай зусім маладых жаўтаротых студэнтак, якія проста захапляліся спевамі народных песень. З цягам часу прыйшло больш глыбокае разуменне сутнасці гэтага жанру і сэнсу песень. Наш творчы старт — удзел у міжнародным фестывалі «Балтыка», які ладзіўся ў Вільні, — гаворыць спявачка гурта Вікторыя Міхно. — Назва каманды шматзначная. Напрыклад, літоўскі лінгвіст Сімас Каралюнас выдзяляе ў балцкіх мовах аснову guda — светлы, яскравы, сапраўдны, праўдзівы. Да таго ж гудай завуць літоўцы нас, беларусаў.

У асноўны склад калектыва ўваходзяць дзевяць чалавек, сярод іх студэнткі і выкладчыцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Цікава тое, што ў гурце няма галоўных. У кожнай удзельніцы ёсць свая выканальніцкая і арганізацыйная роля.

Беларускі этнафолкгурт прымае ўдзел у мерапрыемствах універсітэта, вандруе па Беларусі і радуе творчасцю на міжнародных фестывалях. Напрыклад, некалькі месяцаў таму калектыў быў у Туркменіі. На вечарынах у этнастылістыцы GUDA таксама жаданы госць.

Мне пашчасціла трапіць на адну з галоўных рэпетыцый, дзе я не толькі пабачыла ўсе дзеі на ўласныя вочы, але і даведалася аб гісторыі Каляд і значэнні свята для нашых продкаў.

— У земляробстве год коціцца, нібы кола, паўтараючы поры года адпаведна цыклу сонцастаяння. З 24 снежня да 6 студзеня сонца паварочвае на лета — дзень прыбывае аж да сакавіцкага раўнадзенства, — расказвае мастацкі кіраўнік гурта Любоў Сівурава. — Кола, календы (ад лац. calendae) — назва першага дня кожнага месяца на лацінскай мове. Адсюль назва гэтага святочнага часу, на які прыпадае і свята Нараджэння Хрыста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адчуць калядны дух мне давялося адразу, як толькі ўвайшла ў залу… Удзельніцы гурта распяваліся. Беларускія народныя песні кранулі за душу ўрачыстасцю і глыбокім сэнсам.

Амаль усе калядныя спевы — гэта пажаданні гаспадарам хаты. Калядоўнікі зычылі багацця і здароўя. Напрыклад, выкананне песні «А ішла Каляда па льду» — гэта пажаданне людзям шчаслівых і паслухмяных дзетак, «На нова лета радзі, Божа, жыта» — добрага ўраджаю, а значыць, багацця.

Вядома, што цэнтральная асоба Калядаў Каза — сімвал Новага году, новага сонца. Удзельніцы гурта, акрамя песень, імправізавалі калядныя інтэрмедыі. Ролю Казы выконвала адна са спявачак — Наста Шыманская. Спачатку павадыр вадзіў яе паміж шэрагаў, дзе сядзелі гледачы. Астатнія калядоўнікі хвалілі гаспадароў (у нашым выпадку гледачоў). Потым павадыр зачапіў кіем Казу, якая тут жа ўпала на зямлю, нібы памерла. Каб яна ажывілася, трэба было яе задобрыць — што-небудзь падарыць. Тут згодна традыцыі гаспадары не павінны шкадаваць пірагоў, сала, кілбасы, бо, вядома ж, калядная Каза — сімвалічны гарант добрага ўраджаю ў наступным годзе!

Яшчэ адзін персанаж, якога я бачыла, быў Мядзведзь-памочнік. Калі ён не ў бярлозе, то шукае цёплы кут, носіць мех з падарункамі, бо сілы ў яго багата. Гэтую ролю выконвала ўдзельніца гурта Наталля Краўцова. Акрамя моцы, Мядзведзь валодае талентамі, дэманструе іх і пры гэтым забаўляе народ. Калядны Міхаіл Міхайлавіч спачатку танчыў, а потым паказваў гледачам, як крадзе яблыкі ў суседскім садзе вясковы хлопчык.

Па задумцы ўдзельнікаў гурта ў час святкавання Каляд Мядзведзя яны абяруць сярод гледачоў. І яму абавязкова трэба будзе аддзячыць за творчы ўдзел. Этнафолкгурт вырашыў, што гэта будуць загадзя купленыя цукеркі, напрыклад, «Мішка на паляне».

Акрамя ўсяго, GUDA плануе правядзенне цікавых калядных гульняў. Адна з іх — «Ката пячы» — мне вельмі спадабалася.

Гульня прызначаецца для несямейнай моладзі. Ката напярэдадні свята выпякаюць у печы і аздабляюць так, каб потым ён стаў аб'ектам спаборніцтваў. Хвост, напрыклад, можа быць з кілбасы, вочы — з журавін. Звычайна «жывёлу» высока трымаюць ці падвешваюць. А хлопцы і дзяўчаты павінны падскокваць і без дапамогі рук здолець адкусіць хоць кавалачак. Той, хто першым гэта зробіць, і ажэніцца ў гэтым годзе. Атрымліваецца, што гульня ў ката вызначае лёс.

Нашы продкі сапраўды пакінулі нам багатыя традыцыі і абрады… Асабліва добра, што і сёння моладзь цікавіцца імі. Яшчэ адно пацвярджэнне — нацыянальныя касцюмы, у якіх выконваюць творчыя нумары ўдзельніцы гурта GUDA. І што самае цікавае, кожны касцюм аздабляецца арнаментам той вобласці, дзе нарадзілася спявачка.

Автор: **Ирина РЕПИНА. Фото Лолиты КАЦОРА.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ